ШКОЛЬНАЯ
ПРАГРАМА

# Беларуская мова
# 4 клас

# КУПАЛІНКА

## *Рабочы сшытак*

Дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

Мінск
«Сэр-Віт»
2023

# ПРАДМОВА

***Дарагі дружа!***

Запрашаю цябе ў цікавае і пазнавальнае падарожжа па старонках сшытка «Купалінка». Яно дазволіць табе замацаваць і пашырыць свае веды па беларускай мове, павялічыць твой лексічны запас, дапаможа лепш валодаць роднай мовай. Падарожжа гэта будзе не толькі карысным, але і цікавым. Ты адгадаеш шмат загадак, прыказак, будзеш складаць сказы і тэксты. Калі некаторыя заданні будуць здавацца цяжкімі, не спыняйся, ідзі далей, вывучай старонку за старонкай і ты сам не заўважыш, як усё стане зразумелым, цікавым, захапляльным.

Акрамя таго выкананне некаторых заданняў будзе спрыяць падрыхтоўцы да ўдзелу ў алімпіядах па беларускай мове. Такія заданні прапанаваны ў тэксце як заданні для кемлівых.

Рэгулярна працуючы ў сшытку ты ўпэўнішся, што родная мова прыгожая і мілагучная.

***Карыснага і займальнага падарожжа табе па старонках гэтай кнігі!***

Матэрыял, які прапануецца ў сшытку, ахоплівае ўсе асноўныя тэмы курса беларускай мовы ў чацвёртым класе і накіраваны не толькі на пераадоленне цяжкасцей у вывучэнні прадмета і замацаванне ведаў вучняў па асноўных тэмах, але і выходзіць за рамкі праграмнага матэрыялу. Вучэбны матэрыял па кожнай тэме пададзены з улікам ускладнення і накіраваны на рашэнне задач па адпрацоўцы навыкаў напісання арфаграм. Работа з дапаможнікам дасць магчымасць педагогу арганізаваць дзейнасць вучняў з розным узроўнем ведаў на ўроках, а іх бацькам – праводзіць індывідуальныя заняткі з дзецьмі дома. Заданні, якія пададзены ў гульневай форме, будуць спрыяць падтрыманню ў школьнікаў цікавасці да прадмета. Разнастайныя і пазнавальныя заданні накіраваны на развіццё моўнай кампетэнтнасці вучняў, фарміраванне трывалых арфаграфічных уменняў і навыкаў, пашырэнне лексічнага запасу.

# ПАЎТАРЭННЕ

*Каб нам веды аднавіць –*
*матэрыял патрэбна паўтарыць.*



***Прыстаўка*** *– частка слова, якая стаіць перад коранем і служыць для ўтварэння новых слоў.*
***Корань*** *– агульная частка роднасных слоў.*
***Суфікс*** *– частка слова, якая стаіць пасля кораня і служыць для ўтварэння новых слоў.*
***Канчатак*** *– зменная частка слова, якая служыць для сувязі слоў у сказе.*

**1.** Ад слоўнікавых слоў пры дапамозе суфікса ўтвары і запішы новыя словы. Суфіксы абазнач.

Капялюш, павук, воблака, пошта, пенал, пялёстак, булён, берэт.

________________________________________

________________________________________

________________________________________

**2.** Змяні ў словах прыстаўкі і ўтвары словы з супрацьлеглым значэннем. Запішы іх. Прыстаўкі абазнач.

Ад'ехаць, развітанне, разбіраць, насыпаць, прынесці, падысці, выехаць, заплесці, падагнаць.

________________________________________

________________________________________

________________________________________

**3.** Разбяры дадзеныя словы па саставе.

Белакрылы, лістапад, верталёт, адвяжуць, маленькія, абагналі, высыпае, пад'ехаў, спяваюць.

**4.** Прачытай словы. Устаў прапушчаныя літары. Абазнач корань.

Б..роза, б..розка, б..розавы, б..разняк, падб..розавік.

Сц..на, насц..нны, сц..начка.

Кл..н, кл..новы, кл..нік.

Асіна, асінавы, падасінавік.

Дуб, дубовы, дубняк, дубок, Паддуб’е.

**5.** Змяні словы ў дужках, як патрабуе сэнс. Запішы, абазнач канчаткі.

Займацца (спорт) ____________________

Дапамагчы (мама) ____________________

Рашыць (задача) ____________________

Вучыцца ў (школа) ____________________

Дзякаваць (таварыш) ____________________

Клапаціцца аб (птушкі) ____________________



## Заданне для кемлівых

**6.** Здагадайся, які корань прапушчаны ў словах. Запішы гэтыя словы.

На____, на____заць, пера____аць, пры____ка, с____аць.

____________________________________________

____________________________________________

**7.** У кожным радку знайдзі лішняе слова. Падкрэслі яго.

Страх, страха, страшыць, страхоцце, бясстрашны.

Рак, рака, рачулка, рачны, рэчачка.

Сава, савяня, савянятка, сованне, савіны.

Грам, грымець, гром, грымоты, пагрымець.



*Прыстаўкі **ад-**, **над-**, **пад-**, **перад-**, **прад-**, **аб-** ва ўсіх словах пішуцца аднолькава.*
*Прыстаўкі на **з-** пішуцца перад звонкімі зычнымі.*
*Прыстаўкі на **с-** пішуцца перад глухімі зычнымі.*

**8.** Спішы, устаўляючы патрэбныя прыстаўкі.

..чыніць дзверы, ..шукаць сябра, ..месці двор, ..рэзаць галінку, ..будаваць паверх, ..плыць ад берага.

________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

**9.** Прачытай і растлумач сэнс прыказак. Абазнач у словах прыстаўкі.

Навука вочы адчыняе.

Дзякуй за яблычка не яблыньцы, а таму, хто яе пасадзіў.

Як паклічаш, так і адгукнецца.

Адклад не ідзе на лад.

**10.** Прачытай, устаўляючы ў словы прыстаўкі ***з-*** або ***с-***, абазнач прыстаўкі, падкрэслі першую літару кораня.

..даць, ..клеіць, ..варыць, ..вярнуць, ..пісаць, ..хадзіць,.. вадзіць, ..насіць, ..бегаць, ..весці, ..паліць, ..біць, ..хавацца.

**11.** Прачытай. Дапоўні сказы словамі, якія падыходзяць па сэнсе.

Пчолы ______________________ з кветак мёд.

Вучні ______________________ ў сшыткі тэкст.

Маці ______________________ на абед смачны суп.

Вераб'і ______________ ад дажджу пад страхой дома.



## Заданне для кемлівых

**12.** Абазнач прыстаўкі ў словах, калі яны ёсць.

Падарунак, падарожнік, падэшва, падасінавік, падаіць, падсудны, пасудны, падобны, падтрымаць, пабудаваць.

**13.** З рассыпаных слоў складзі беларускія прыказкі і прымаўкі пра хлеб. Запішы іх. Абазнач у словах прыстаўкі.

У таго, рана, стае, хто, устае, хлеба.
Сам, колькі, лепш, а, не прыдумаеш, хлеба, ні думай.
Пражывеш, без хлеба, без золата, а, не.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**14.** Выберы тое слова, якое ўжываецца ў фразеалагічным звароце. Запішы. Вызначы прыстаўкі ў словах.

(Браць, хапаць) сябе ў рукі ______________________

Падмазваць (пяткі, ногі) ______________________

Замятаць (сляды, крокі) ______________________

(Вылузвацца, выходзіць) са скуры ______________________

(Прыкусіць, прышчаміць) язык ______________________



*У словах пішуцца побач **дзве аднолькавыя** літары, калі:*

- ***чуецца падоўжаны гук*** — *ноччу*
- ***на стыку прыстаўкі і кораня*** — *бясстрашны*
- ***на стыку кораня і суфікса*** — *каменны*

**15.** Запішы сказы, выбіраючы патрэбную літару або спалучэнне літар. Абазнач у выдзеленых словах прыстаўку і корань.

У м(а/о)ім п(а/о)коі ніколі н(е/я)ма **бе(с/сс)парадку.**

Гэтая зіма была амаль **бя(с/сс)нежная.**

Мне пр(і/ы)йшлося **а(б/бб)егчы** не адну краму ў пошуках **п(о/а)д(о/а)рунка** для брата.

Перад маімі в(о/а)чамі **ра(с/сс)кінулася бя(з/зз)м(е/э)жнае** мора цвітучага льну.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**16.** Утвары словы па ўзоры.

Корань – *карэнны.*

лімон – ______________

смятана – ______________

камень – ______________

машына – ______________

ажына – ______________

восень – ______________

вагон- ______________

сон – ______________

дзень – ______________

конь – ______________

агонь – ______________



**Заданне для кемлівых**

**17.** Падкрэслі словы, у якіх спалучэнні ***дз***, ***дж*** абазначаюць два гукі.

Дзяцел, дзеці, падзямелле, сядзіць, джала, адзваніла, аджывае, дзюба, дзівак, джунглі.

**18.** Падзялі словы на дзве групы і запішы: першая група – словы з падаўжэннем зычных; другая група – словы з падваеннем зычных.

Аддача, галлё, жыццё, ранні, бяззубы, ссыпаць, збожжа, снеданне, законны, багацце.

| I | II |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**19.** Разгледзь уважліва табліцу. Раскажы пра кожную часціну мовы.

| Часціна мовы | Абазначае | Пытанні | Мае | Змяняецца | Роля ў сказе |
|---|---|---|---|---|---|
| **Назоўнік** | прадмет | *хто? што?* | род | па ліках | дзейнік даданы член сказа |
| **Прыметнік** | прымету прадмета | *які? якая? якое? якія?* | | па ліках<br><br>у адзіночным ліку па родах | даданы член сказа |
| **Дзеяслоў** | дзеянне прадмета | *што рабіць? што зрабіць?* | | па ліках па часах у прошлым часе па родах | выказнік |
| **Прыназоўнік** | | | | | для сувязі ў сказе |

**20.** Прачытай сказы. Абазнач над словамі часціны мовы.

Яснае сонейка выглянула з-за сасновага бору.

Лёгкі ветрык гуляе з лісточкамі маладых дрэў.

Над рэчкай павісла каляровая вясёлка.

Цёмная дажджавая хмара навісла над зямлёй.

**21.** Запішы па 5 слоў у кожны слупок.

| Назоўнік | Прыметнік | Дзеяслоў |
|---|---|---|
| ______ | ______ | ______ |
| ______ | ______ | ______ |
| ______ | ______ | ______ |
| ______ | ______ | ______ |
| ______ | ______ | ______ |

**22.** З рассыпаных слоў складзі і запішы сказ. Падкрэслі дзейнік і выказнік.

Садзе, прыгожую, у, вішаньку, дзядуля, маладую, пасадзіў.

Сілы, расло, і, дрэўца, набіралася.

Вішанькі, зялёныя, усход, лісточкі, кожны, сустракалі, сонца, дзень, радасна.

______________________________

______________________________

______________________________



## Заданне для кемлівых

**23.** Прыдумай сінонімы да слоў з той жа колькасцю літар і запішы. Вызначы іх род.

Яда – ______________ муроґ – ______________

кветка – ______________ тэрмометр – ______________

лес – ________________ боязь – ________________

**24.** Запішы 5 назоўнікаў па тэме «Садавіна і агародніна». Падбяры да іх прыметнікі, якія падыходзяць па сэнсе, і запішы. Вызначы іх род.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**25.** Пазнай прыказку па апорных словах. Запішы. Вызначы час кожнага дзеяслова.

Нарадзіўся – прыгадзіўся

______________________________________________

не раскусіш – не з'ясі

______________________________________________

жыві – вучыся

______________________________________________

збірайся – сей

______________________________________________

**26.** Складзі сказы са словамі «рана» і «піла», каб гэтыя словы былі рознымі часцінамі мовы.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**7.** Да прапанаваных назоўнікаў падбяры па 2 аднакаранёвыя прыметнікі.

Дождж – ______________________________

Ураджай – ______________________________

Балота – ______________________________

Кроў – ______________________________

Бой – ______________________________



### Заданне для кемлівых

**8.** Прачытай. Дапішы прыказкі. Вызначы часціны мовы.

Малым пачалося, а ____________________ скончылася.

Ад добрага не ўцякай і ____________________ не рабі.

Чорнае ______________________________ не стане.

**9.** Прачытай сказ. Якімі часцінамі мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы? Пазнач зверху. Падкрэслі галоўныя члены сказа і выпішы словазлучэнні.

З маладзенькай **ліпкі** дзяўчынка сарвала **ліпкі** лісток.

______________________________________________

______________________________________________

## ЗМЕСТ


Прадмова . . . . . . . . . . 3
Паўтарэнне . . . . . . . . . . 4
Тэкст . . . . . . . . . . 12
Сказ . . . . . . . . . . 22
Слова . . . . . . . . . . 35
Часціны мовы . . . . . . . . . . 38
Прыметнік . . . . . . . . . . 66
Займеннік . . . . . . . . . . 83
Дзеяслоў . . . . . . . . . . 91
Паўтарэнне . . . . . . . . . . 109